# Рэгіна МІРОНАВА: «ЛЮБЛЮ ДЗЯЦЕЙ, А НЕ КАР'ЕРУ»

НЕТАРОПКА яна крочыць на Магілёўскую, 37. З ёй часта вітаецца моладзь — студэнты факультэта дашкольнага выхавання Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. Танка. Некаторыя спыняюць яе, нешта ўдакладняюць, раяцца...

Менавіта сюды, на факультэт дашкольнага выхавання, і ідзе Рэгіна Міхайлаўна Міронава. Лекцыі, практычныя заняткі, кансультацыі для студэнтаў-дыпломнікаў, курсавікоў, завочнікаў — гэта штодзённы рытм яе жыцця.

З 1987 года Рэгіна Міхайлаўна працуе на факультэце дашкольнага выхавання. Яе пяру належаць больш як 150 навукова-метадычных прац, артыкулаў, манаграфій. Кніга Рэгіны Міхайлаўны «Педагагічныя тэхналогіі ў дашкольнай установе» — сёння настольная кніга для супрацоўнікаў дзіцячых садоў краіны.

Мікалай Антонавіч Анімах, дэкан факультэта дашкольнага выхавання, называе Р. М. Міронаву «залатой зоркай на педагагічным небасхіле дашкольнага выхавання». Не раз даводзілася назіраць, як любяць Рэгіну Міхайлаўну студэнты, і як мудры педагог умее бесканфліктна вырашаць любую складаную сітуацыю са студэнтамі. На грамадскіх пачатках Р. М. Міронава займаецца эксперыментальнай, даследчай работай у Вішнёўскім дзіцячым садзе Мінскага раёна. Семінары, наведванне заняткаў у групах і іх аналіз, знаёмства выхавальнікаў сада з навінкамі псіхолага-педагагічнай навукі, кансультацыі бацькам і пачынаючым выхавальнікам, метадычная дапамога загадчыку — гэта канкрэтная дапамога Рэгіны Міхайлаўны сваім падшэфным.

*Люблю дзяцей. Люблю бясконца.*
*І не магу іх не любіць.*
*Я для дзяцей дастала б сонца,*
*Каб іх шчаслівымі зрабіць,*

— так кажа Рэгіна Міхайлаўна, і гэта яе жыццёва-педагагічнае крэда...

А НАРАДЗІЛАСЯ яна ў вёсцы Цэзарова, што на Магілёўшчыне. Рэгіна была ў сям'і сёмай. Чакалі сына, а нарадзілася прыгажуня-дачка. Сваё басаногае дзяцінства Рэгіна Міхайлаўна правяла ў «школе» дзядулі Геранімa. Песнямі і байкамі, расповедамі пра родны край, пра людзей вёскі «выхоўваў» стары Геранім любую Рэгінку.

У 1948 годзе, калі Рэгіне споўнілася шэсць з паловай гадоў, яе адправілі ў Яноўскую сямігодку, якую яна закончыла на «выдатна». Потым за дзесяць кіламетраў хадзіла ў Градзянскую сярэднюю школу.

Закончыўшы сярэднюю школу ў 1958 годзе, марыла стаць студэнткай Белдзяржуніверсітэта, а траніла на вучобу ў Магілёўскае педагагічнае вучылішча. І ўсе гады была на сцэне: вядучая, актрыса, дэкаратар, касцюмер. Яна вяла канцэрты ў Палацы моладзі г. Магілёва. Р. М. Міронаву бачылі актрысай, чалавекам сцэны. Але любоў да дзяцей дашкольнага ўзросту перамагла. У 1960 годзе пасля заканчэння вучылішча, яе, як лепшую выпускніцу, накіравалі ў дзіцячы сад № 22 абутковай фабрыкі «Прамень», што ў Мінску. Ужо ў першы дзень працы Рэгіна Міхайлаўна атрымала падзяку ад загадчыцы сада Любові Лук'янаўны Бліцко.



У 1961 годзе паступіла на вячэрняе аддзяленне факультэта дашкольнага выхавання і з адзнакай закончыла яго. З 1966 года Рэгіна Міхайлаўна пачынае працаваць выхавальнікам у яслях-садзе № 257, з 1968 года — загадчык дзіцячага сада № 78. Затым была загадчыкам дзіцячых садоў № 113, 104, 210.

ТРЭБА сказаць, што Рэгіна Міхайлаўна — чалавек з аналітычным складам мыслення, чалавек, які любіць навуку, кнігу. Чалавек творчы, які жадае сам ствараць кнігі, ствараць свае адукацыйна-выхаваўчыя сістэмы. Яшчэ працуючы ў дзіцячым садзе № 210, Рэгіна Міхайлаўна занялася навукай: яе артыкулы пачалі з'яўляцца ў педагагічным друку, у навуковых часопісах.

У 1976 годзе Р. М. Міронава паступіла ў аспірантуру пры Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага. Асабліва памятным быў экзамен па агульнай псіхалогіі, бо здавала яна яго ў кабінеце тагачаснага рэктара Фрола Парфір'евіча Шмыгава, старшыні камісіі. Яна адказвала паўтары гадзіны. Фрол Парфір'евіч сказаў: «Вы будзеце цудоўным лектарам, любімым выкладчыкам, выдатным вучоным у галіне дашкольнай адукацыі». І не памыліўся.

Ужо ў 1978 годзе Рэгіна Міхайлаўна Міронава прыйшла ў Беларускі навукова-даследчы інстытут педагогікі, у лабараторыю дашкольнага выхавання. З 1980 года — яна старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі, затым яе кіраўнік. Гэта яна была з тымі, хто жадаў навучаць шасцігодак у школе. Гэтаму Рэгіна Міхайлаўна прысвяціла шмат часу. Навукова даказвала неабходнасць стварэння падрыхтоўчых класаў. Як клапатлівая маці, Р. М. Міронава «разам з шасцігодкамі» пайшла ў школу, каб на сабе адчуць значнасць справы, каб даследаваць, эксперыментаваць (зразумела, на карысць дзецям), абгрунтаваць неабходнасць навучання з шасці гадоў. Была яна і старшынёй прафсаюзнага камітэта НДІ педагогікі.

ПЕДАГАГІЧНЫ універсітэт імя М. Танка — другі родны дом для Р. М. Міронавай. Тут яе любімыя студэнты, тут дарагія калегі, тут яе рабочае месца. Справе дашкольнага выхавання Рэгіна Міхайлаўна прысвяціла 41 год. Гэта многа, асабліва калі лічыць, што аддадзены гэтай справе лепшыя гады жыцця. І сёння, аглядаючыся назад, Рэгіна Міхайлаўна кажа:

*Люблю дзяцей. І лёс, і крэда*
*Бяруць пачатак з пачуцця.*
*І мой дашкольнік — як планета*
*У гэтым цэнтры развіцця.*

*І мой дашкольнік — ёсць асоба!*
*Хай не раз'есць душу іржа.*
*Калі выхоўвае вучоба,*
*То развіваецца душа.*

*Люблю дзяцей, а не кар'еру,*
*Сваёй работай ганарусь.*
*За садкі радасці, я веру,*
*Прагаласуе Беларусь!*

**Па даручэнні калег па працы:**

**Таццяна ПАЗДЗЕЕВА,**
**намеснік дэкана факультэта дашкольнага выхавання БДПУ імя М. Танка,**

**Мікалай ГРУДЗІНСКІ,**
**старшы выкладчык кафедры кіравання Мінскага абласнога ІПК**